# Ігуменскі тракт

№ 3 (61)

■ Дзеля памяці

## ШТО МОЖА ЭТНОГРАФ?

**«Калі нацыя знікне, яе можна будзе адрадзіць па тваёй кнізе…» — прагучала ў спектаклі памяці выдатнага беларускага этнографа Міхася Раманюка. Чалавек, які ездзіў па розных рэгіёнах Беларусі, сам і за свае грошы часта планаваў падарожжы выключна дзеля таго, каб захаваць скарбы матэрыяльнай культуры беларусаў. Ён адчуваў персанальную адказнасць за тое, ці захаваецца гэтая культура. І яшчэ ў савецкі час рабіў тое, што здавалася немагчымым: паказваў, што ёсць такі народ і чым ён адметны. У 1981 годзе была выдадзена кніга, пра якую гаворка,— «Беларускае народнае адзенне».**

Адна кніга — але якое яе значэнне! Прычым кніга не літаратурнага зместу, а фактычна альбом фотаздымкаў людзей у беларускіх строях з розных рэгіёнаў у іх натуральным асяродку. У маім выпадку менавіта гэтая кніга, атрыманая аднойчы ў падарунак, аказалася знакам лёсу.

Маё пакаленне расцілі патрыётамі вялікай краіны. Узровень патрыятызму для падлеткаў майго часу вымяраўся ў захапленнях героямі фільмаў. Такімі, напрыклад, як Шцірліц. Але мне падабалася радыстка Кэт, таму я стала займацца радыёспортам, асвойвала азбуку Морзэ, вучылася шукаць варожыя перадатчыкі ў лесе. Аднойчы за перамогу на абласных спаборніцтвах па радыёспорце мне ў якасці падарунка ўручылі кнігу «Беларускае народнае адзенне». Дзяўчаты (мы спаборнічалі ў катэгорыі юніёрак), якія занялі другое і трэцяе месца, з мяне кпілі: іх падарункі аказаліся больш карысныя — шкатулка і керамічная ваза. Але ж — падарунак! Кніга паехала са мной дадому, хоць я на той момант не вельмі разумела, пра што яна. Але калі яе пабачыла мама, то стала шукаць: а дзе ж у ёй наш раён? І знайшла! Я дзівілася самому факту, што, аказваецца, у падобных строях хадзіла мая бабуля…

І вось як яно бывае: я не займаюся больш радыёспортам, наогул «марзянка» страціла сэнс ва ўмовах развіцця тэхналогій. Аднак ніякія тэхналогіі не перакрэсляць значэнне кнігі «Беларускае народнае адзенне», якую склаў Міхась Раманюк. З таго моманту, як я атрымала гэты падарунак, маё разуменне патрыятызму змянілася. Сутнасць любові да радзімы ўвасобілася ва ўзорах і рэчах, якія ішлі ад цёплых рук, дайшлі праз часы і эпохі. Жывуць у маёй свядомасці як вобразы таго самага патрыятызму, у якім ніхто ні з кім не спаборнічае, але ўсе знаходзяцца на сваіх месцах.

Мне хочацца пра гэта гаварыць. Хочацца распавядаць пра ролю Міхася Раманюка, які быў патрыётам і нёс гэта праз справу. Пакінуў пасля сябе яшчэ спраў для сына Дзяніса, які запрасіў узгадаць бацьку добрым словам у гэты студзеньскі час, калі кожны дзень можна было б святкаваць нараджэнне Міхася Раманюка. Але ж у нас, у беларусаў, не заўсёды дакладна фіксаваліся дні прыходу ў свет. Можа, таму, што галоўным сведчаннем жыцця чалавека лічыліся яго справы.

**Ларыса ЦІМОШЫК,**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

Падчас канцэрта-прысвячэння Міхасю Раманюку.

■ Фаліянты

## ДРУКАВАНЫЯ СВЕДКІ ГІСТОРЫІ

### У Прэзідэнцкай бібліятэцы — больш за 20 старажытных кнігазбораў

**Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь напрыканцы мінулага года адсвяткавала свой 80-гадовы юбілей. Калісьці яна называлася Урадавай, і толькі ў сярэдзіне 1990-х стала Прэзідэнцкай. А нядаўна была прапанова да назвы дадаць «імя Льва Сапегі», бо гэта таксама найвышэйшая службовая асоба свайго часу і, да ўсяго, заўзяты чытач і бібліяфіл. Бібліятэка найперш забяспечвае інфармацыяй уладныя і кіруючыя структуры — дэпутатаў парламента, супрацоўнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта і амаль усіх міністэрстваў. Аднак і іншыя ахвотныя могуць скарыстацца яе паслугамі ў чытальнай зале. Акрамя профільных аддзелаў бібліятэкі, якія працуюць для абслугоўвання праблем эканомікі, права, дзяржаўнага кіравання, ёсць і аддзел старадрукаў і рэдкіх выданняў, куды і завітала карэспандэнт «Звязды».**



**Загадчык аддзела Валерый ГЕРАСІМАЎ** расказаў пра няпросты лёс многіх кніг і цэлых бібліятэк, а таксама паказаў некаторыя ўнікальныя кнігазборы, якія знаходзяцца ў сховішчах гэтай установы.

### Кнігі — у абмен на бочку баравікоў

Спадар Герасімаў распавёў, што да Вялікай Айчыннай вайны ў бібліятэкі быў надзвычай каштоўны фонд. Бо сярод літаратуры, якая трапляла сюды, былі кнігі, канфіскаваныя са шляхецкіх маёнткаў, старажытных каталіцкіх кляштараў і праваслаўных манастыроў. Існаваў дзяржаўны фонд размеркавання літаратуры: кнігі звозіліся ў Мінск, а пасля накіроўваліся ў розныя бібліятэкі.

Частка гэтага даваеннага фонду захавалася. Аднак лепшае падчас вайны немцы вывезлі на Захад. Кнігі захоўваліся ў скляпеннях польскіх, нямецкіх замкаў. Некаторыя выданні былі вернуты, а разам з імі бібліятэка атрымала шмат каштоўнай заходняй літаратуры. І з гэтым звязана адна цікавая гісторыя.

Калі Чырвоная Армія заняла Германію, салдаты трапілі на сховішча кніг, нарабаваных у беларускіх бібліятэках. Яны сталі адпраўляць лісты на радзіму, пісалі пра свае знаходкі і пасылкамі дасылаць кнігі. Адказныя супрацоўнікі культуры вырашылі, што, каб вярнуць кнігі, трэба дзейнічаць, і накіравалі туды сваю дэлегацыю. А каб справа ішла лепш, захапілі з сабой пачастункі: бочачку салёных баравічкоў з Белавежскай пушчы, кавалак літога шакаладу з фабрыкі «Камунарка», моцную настойку, таксама паходжаннем з Белавежскай пушчы. Усё ўручылі маршалу Канстанціну Ракасоўскаму, які ў той час камандаваў Паўночнай групай савецкіх войск у Германіі. Падарунак зрабілі ад землякоў земляку, вынік аказаўся сапраўды добрым: былі спецыяльна выдзелены два эшалоны, і кнігі, якія вывезлі немцы (тое, што ўдалося адшукаць), вярнуліся назад. Разам з імі трапілася і некаторая каштоўная заходняя літаратура. Усё размеркавалі ў дзве бібліятэкі — Нацыянальную і Прэзідэнцкую (тады — Урадавую).

### Радзівілаўскія зборы

Валерый Герасімаў расказвае, што калісьці ў Нясвіжы была багацейшая бібліятэка — 20–30 тысяч кніг і мільён архіўных дакументаў. Цяпер там толькі 3 кнігі са збораў Радзівілаў. Каля 3500 кніг — у бібліятэцы Акадэміі навук, звыш 500 — у Нацыянальнай. Адно выданне ёсць ва Універсітэце культуры, яшчэ некалькі — у беларускіх музеях. Аднак большасць кніг і дакументаў знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу, а таксама ў Маскве, Хельсінкі, Варшаве. Загадчык аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў адзначае:

— Уся спадчына параскідана па свеце — і ў гэтым вялікая трагедыя культуры нашых маленькіх гарадоў і былых мястэчкаў. Я прыхільнік таго, каб літаратура, як і іншыя культурныя каштоўнасці, вярталася на радзіму, і лічу, што з часам уся бібліятэка Радзівілаў павінна быць у Нясвіжы. Трэба рабіць электронныя копіі і вяртаць кнігі на месца іх першапачатковага знаходжання.

У Прэзідэнцкай бібліятэцы сёння да 130 кніг з радзівілаўскай бібліятэкі. Яны пераважна на замежных мовах, таму, з пункту гледжання зместу, для сучаснага масавага чытача не надта цікавыя, мяркуе Герасімаў. Але ёсць і на рускай мове, напрыклад «Нататкі пра харчаванне войскаў у ваенны час» за 1860 год з подпісам: «Яго светласці Льву Людвігавічу князю Радзівілу». На 19-й старонцы стаіць штамп (часам проста нумар) — і гэта адна з прыкмет радзівілаўскай бібліятэкі. Ёсць кнігі з маляўнічымі экслібрысамі — наклеенымі кніжнымі знакамі. (На самых старажытных выданнях іх рабіў знакаміты ў свой час мастак-яўрэй Гершка Лейбавіч.)

Радзівілы ўдзельнічалі ў многіх паўстаннях або падтрымлівалі іх удзельнікаў. Таму калі паўстанне цярпела паражэнне, у іх усё канфіскоўвалі, а бібліятэкі вывозілі на Усход. Але Радзівілы зноў пачыналі збіраць кнігі… Таму можна казаць нават пра розныя бібліятэкі Радзівілаў — XVII, XVIII, IXX і XX стагоддзяў.

### Архівы БНР

Колькі гадоў таму, ужо ў сучаснай Беларусі, асобы высокага дзяржаўнага ўзроўню зацікавіліся дакументамі з архіваў БНР. Аднак у фондах Прэзідэнцкай бібліятэкі іх не аказалася. Супрацоўнікі сталі шукаць патрэбныя звесткі і знайшлі іх у двухтомным зборніку «Архівы БНР», выдадзеным некалі ў канцы 1990-х у Вільні пры фундатарскай дапамозе беларусаў замежжа. Кнігі ўяўляюць сабой падборку дакументаў Беларускай Народнай Рэспублікі, пераважна з замежных архіваў. Імі апекаваліся калісьці беларусы, якія працавалі ў Вільні. Кнігі ўдалося набыць у фонд Прэзідэнцкай бібліятэкі, і цяпер, пры патрэбе, чытачы могуць з імі азнаёміцца.

Гэта рэдкае выданне ў сілу сваёй унікальнасці і малатыражнасці, мяркуе Герасімаў, тым больш што ў наш час у архівах Літвы такую інфармацыю самастойна адшукаць даволі складана.

### Выданні беларускага замежжа

Яшчэ адна адметная калекцыя — бібліятэка Алеся Баркоўскага. Гэта вядомы бібліяфіл, які ўсё жыццё збіраў выданні, надрукаваныя беларусамі за мяжой. Ён пастаянна ліставаўся з нашымі суайчыннікамі, якія жылі ў іншых краінах, замаўляў кнігі. Штосьці ў савецкі час не прапускалі з ідэалагічных прычын, але многае да яго ўсё ж трапляла.

Лета Алесь Баркоўскі праводзіў на рацэ Лена ў Сібіры, дзе працаваў капітанам невялікага судна. А зімой вяртаўся ў Беларусь, тут у яго была сям'я, кватэра,— і ўсё жыццё ён збіраў такія кнігі. «Прыкрыццём» яго калекцыі было тое, што іх збіральнік быў не прафесійным навукоўцам, а аматарам. Такі інтарэс звычайнага працоўнага чалавекам тады нікому «не муляў вока».

У наш час Баркоўскі зразумеў, што сам усе свае кнігі не апрацуе, хаця ён і вядомы сярод прафесійных гісторыкаў як аўтар цікавых арыгінальных даследаванняў і публікацый па пытаннях беларускай дыяспары і лёсах рэпрэсаваных суайчыннікаў, што апынуліся ў Сібіры. Таму частку калекцыі ён падарыў Нацыянальнай бібліятэцы, а частку — Прэзідэнцкай. У запасніках апошняй ёсць, напрыклад, «Беларусь у датах, ліках і фактах», Парыж, 1950 год. У ёй змяшчаюцца статыстычныя і гістарычныя даныя па нашай краіне, якія збіраліся з архіваў розных краін. Валерый Герасімаў адзначае:

— Гэта ўнікальныя кнігі, бо беларуская дыяспара, у параўнанні, напрыклад, з яўрэйскай ці кітайскай, жыла даволі сціпла. Аднак на тыя грошы, якія былі, яны нешта выдавалі, захоўвалі мову, культуру. Сёння па такія выданні часта прыходзяць з універсітэтаў — і выкладчыкі, і студэнты — усім гэта патрэбна і цікава.

### Лёс дзяржаўнай мяжы

Ёсць у сховішчах Прэзідэнцкай бібліятэкі кнігі, пра якія можна сказаць, што яны вырашылі лёс дзяржаўнай мяжы Беларусі. Сярод такіх «Хронікі зямлі Рускай» — самастойная частка «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні, выдадзенай на польскай мове ў Кракаве ў 1611 годзе. Італьянец па паходжанні, Гваньіні быў калісьці камендантам Віцебскага замка. Потым на радзіме ён пісаў успаміны, як служыў на Беларусі.

Самае каштоўнае ў яго творы для нас — гэта апісанне беларускіх зямель. Яно мае і практычнае значэнне. Калі Рэспубліка Беларусь атрымала поўную незалежнасць на пачатку 1990-х гадоў, у Прэзідэнцкую бібліятэку прыходзілі памежнікі высокага рангу, якія займаліся вызначэннем мяжы з Расіяй. Кнігу Гваньіні яны таксама глядзелі, бо на той час мела істотнае значэнне, каму гістарычна належалі тыя або іншыя землі і дзе знаходзіліся мытныя пераходы. А тут мяжа была дакладна апісана.

Апошняя глава кнігі Гваньіні мае ўжо не геаграфічную, а сельскагаспадарчую каштоўнасць і называецца «Спосаб арання і сеяння ў тых ваяводствах Белай Русі, якія ў Вялікім Княстве Літоўскім прылягаюць да маскоўскіх зямель». Асобнік гэтай кнігі быў калісьці і ў Якуба Коласа. Вядома, што каля дома народнага паэта была дзялянка, на якой ён садзіў жыта па тэхналогіі, што апісана Гваньіні. Яна заключаецца ў тым, што разам садзіцца жыта і ячмень. Яны выспяваюць у розны час, таму ўбіраюць спачатку жыта, а ячмень тым часам не дае расці пустазеллю. Пасля Якуба Коласа гэтым спосабам зацікавілася і Акадэмія навук.

### З подпісам аўтара

Калі збіральнік кніг памірае, родныя часта прадаюць яго кніжныя скарбы. Адбываецца гэта і са спадчынай найбольш знакамітых асоб. Так і першы сакратар ЦК КПБ Панцеляймон Панамарэнка, хоць і быў рускім па крыві, меў вельмі багатую беларускую бібліятэку. Аднак яна была распрададзена яго сваякамі. Пазней архівісты і бібліятэкары пад кіраўніцтвам знакамітага беларускага гісторыка і кнігазнаўцы Віталя Скалабана нават склалі зводны каталог бібліятэкі і архіва Панамарэнкі. Уключаны ў яго і некалькі выданняў з кнігазбору Прэзідэнцкай бібліятэкі.

Увогуле ў Прэзідэнцкай бібліятэцы вылучылі каля 20 асобных калекцый беларускіх гістарычных кнігазбораў. Сярод іх варта адзначыць і бібліятэку Саюза беларускіх пісьменнікаў, які калісьці змяшчаўся на вуліцы Фрунзэ, 5. Калі творцы выехалі з Дома літаратара, для іх бібліятэкі таксама не стала месца. Таму яны пачалі шукаць, куды б перадаць свае фонды. Прэзідэнцкая бібліятэка ўзяла да сябе кнігі з аўтографамі. Гэта каля 5000 выданняў з подпісамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Васіля Быкава і многіх іншых творцаў, якія дарылі іх сваёй роднай бібліятэцы.

Зразумела ж, захоўваюцца тут і арыгіналы ўсіх беларускіх канстытуцый, маніфесты аб утварэнні нашай краіны ў розныя часы станаўлення яе дзяржаўнасці. Ёсць кнігі па літуаніцы, ўкраініцы і гебраіцы, архівы многіх даваенных газет.

Валерый Герасімаў кажа, што пры жаданні з гэтымі кнігамі можа азнаёміцца кожны, хто мае ў гэтым патрэбу. Адзіны крытэрый — пастарацца максімальна працягнуць іх тэрмін службы.

Парадокс, але многія рарытэты дайшлі да нас у добрым стане дзякуючы таму, што ў савецкі час былі ў спецзахоўванні. Сярод такіх выданні з бібліятэк Вацлава Ластоўскага, Кастуся Езавітава, Аркадзя Смоліча, Усевалада Ігнатоўскага. Цяпер усе ідэалагічныя абмежаванні зняты, і 70 тысяч рэдкіх кніг чакаюць сваіх чытачоў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

### Да ведама:

*«Канстытуцыйнае права» — гэта сумесны праект Прэзідэнцкай бібліятэкі з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі. У яго ўваходзяць усе канстытуцыйныя акты Беларусі, пачынаючы з IX стагоддзя і па сёння. Інфармацыя змешчана на 4 дысках, а таксама на сайце pravo.by. На сайце бібліятэкі preslib.org.by можна адшукаць бібліяграфію па гэтай тэме.*

*«Дзяржаўныя палітычныя дзеячы Беларусі» — у гэтым праекце збіраецца інфармацыя з пачатку XX стагоддзя і па сёння. У ім будзе змяшчацца біяграфія дзеяча і ўсе яго прамовы.*

*Усю інфармацыю бібліятэкары распісваюць тэматычна і ўводзяць у электронны каталог і базы даных. Гэта дапамагае зарыентавацца і знайсці менавіта тое, што трэба, за вельмі кароткі час.*

■ Брэнд краіны

## АДНОВІМ СЯДЗІБУ. УСТАЛЮЕМ ПОМНІК

### Як адсвяткаваць 200-годдзе самага славутага мінчаніна — Станіслава Манюшкі? Грамадскасць вырашыла ўнесці свае прапановы

**Як той казаў, рыхтуй сані летам, а колы зімой. Гэта слушна і ў дачыненні да юбілею, які адбудзецца ў 2019 годзе.**

Яшчэ паўгода таму ініцыятыўная група на чале з Алесем Белым і Дзянісам Салашам пачала збіраць подпісы за тое, каб у беларускай сталіцы нарэшце ўсталявалі ***помнік*** славутаму земляку. На снежань мінулага года ў іх было ўжо 4000 подпісаў, якія яны перадалі ў Мінскі гарвыканкам. Аднак высветлілася, што праца над стварэннем помніка кампазітару ўжо вядзецца. Больш за тое, вырашана, што Станіслаў Манюшка ў скульптурнай кампазіцыі будзе не адзін, а разам з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. Творцы будуць сядзець адзін насупраць аднаго. Гэта і не дзіўна, бо калісьці супрацоўніцтва літаратара і музыканта было надзвычай плённым. Разам яны стварылі чатыры камічныя оперы, уключаючы знакамітую «Ідылію» («Сялянку»). Яе прэм'ера адбылася ў Мінску ў 1852 годзе. Тады ўпершыню пасля доўгага перапынку са сцэны Вялікага тэатра загучала беларуская мова.

Як і марыла грамадскасць, помнік усталююць у самым прыгожым цэнтральным месцы беларускай сталіцы — на плошчы Свабоды, насупраць гарадской ратушы. І такі выбар невыпадковы. Бо менавіта з гэтымі месцамі цесна звязана біяграфія Манюшкі. Калісьці ён з сям'ёй жыў у будынку на Энгельса, 3, наведваў музычную школу, якая размяшчалася ў ратушы, вучыўся ў гімназіі (цяпер будынак абласвпрафа). Акрамя таго, ёсць дакументальныя згадкі пра тое, што Манюшка наведваў і іншыя будынкі на плошчы Свабоды і побач з ёй. Аргументам на карысць менавіта такога размяшчэння помніка служыць і тое, што зараз побач сканцэнтравана вялікая колькасць устаноў музычнай культуры: Беларуская акадэмія музыкі, музычная школа імя Глебава і канцэртная зала «Верхні горад». Усё гэта робіць спрыяльным суседства з помнікам знакамітаму кампазітару.

Алесь БЕЛЫ дадаў, што плошчу Свабоды варта было аздобіць і ***адмысловым музычным фестывалем,*** прысвечаным Манюшку, які быў бы разлічаны не на прафесійных знаўцаў, а на ўсіх ахвотных. Спасылаючыся на знаёмага спецыяліста па брэндынгу, Белы заўважыў, што Мінск на сёння — «нямы» горад. Публічна музыка амаль нідзе не гучыць. Музычная спадчына Станіслава Манюшкі магла б дапамагчы вырашыць гэтую праблему і, відавочна, была б усім даспадобы. Шмат у беларускай сталіцы было славутых грамадзян, якія плённа папрацавалі дзеля яе дабрабыту, аднак толькі Манюшка шырока вядомы і за мяжой. Таму яго імя можна выкарыстоўваць як брэнд краіны, упэўнены Белы.

Не менш радаснай навіной сустрэчы, якую ладзіў Беларускі фонд культуры і Беларускі камітэт «ICOMOS» у Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, стала тое, што прадпрымальнік Яўген Глебаў бярэцца прафінансаваць ***аднаўленне радавой сядзібы*** Манюшкаў у вёсцы Убель Чэрвеньскага раёна, дзе нарадзіўся кампазітар, і падрыхтаваць яе да музеефікацыі.

**Мінск на сёння — «нямы» горад. Публічна музыка амаль нідзе не гучыць. Музычная спадчына Станіслава Манюшкі магла б дапамагчы вырашыць гэтую праблему.**

Рэстаўратар Сяргей ДРУШЧЫЦ расказаў, што на сядзібе ўжо былі праведзены археалагічныя раскопкі. Яны выявілі, што падмурак захаваўся даволі добра. Быў створаны і рабочы праект па адбудове дома. Знайшлі шмат аўтэнтычнай кафлі, па ўзоры якой даволі дакладна можна аднавіць інтэр'еры. Знешні выгляд дома таксама адлюструе мінулае, бо захаваліся малюнкі бацькі Манюшкі, а таксама план і гравюра Напалеона Орды.

Цікава, што месца, якое з'яўляецца прататыпам аднаго з самых вядомых твораў Манюшкі — «Страшнага двара», таксама знаходзіцца ў Беларусі, у Смілавічах. Там цяпер руіны, а калісьці былі дом і вежа з гадзіннікам, дзе жыў дзядзька кампазітара. Станіслаў часта бываў у яго. Дзядзька расказваў хлопчыку розныя жахі, што апоўначы гадзіннік спыняецца, а з партрэтаў выходзяць намаляваныя людзі. Гэта так уразіла будучага кампазітара, што праз пэўны час ён… стварыў велічную оперу «Страшны двор».

Развагі былі і пра тое, якую ***вуліцу назваць іменем Манюшкі.*** Частка грамадскасці настойвала, што адрэзак Інтэрнацыянальнай павінен мець такую назву, бо гэта сапраўды адпавядае гісторыі: там кампазітар праводзіў найбольш часу. Аднак гісторык і экскурсавод Іван САЦУКЕВІЧ упэўнена абараняў іншы варыянт. У мікрараёне Лошыца на перакрыжаванні з новым Ігуменскім трактам ужо запраектавана вуліца Манюшкі, і гады праз два-тры там пачнуць з'яўляцца дамы. Сацукевіч кажа, што такім чынам ствараецца добры турыстычны маршрут: ад гістарычнага цэнтра Мінска спачатку праехаць па вуліцы Маякоўскага, потым па яе працягу — новым Ігуменскім тракце, пасля можна спыніцца на перакрыжаванні з вуліцай Манюшкі і паглядзець на памятную шыльду (усталяваць яе — справа некалькіх месяцаў). Далей шлях ідзе на Смілавічы, затым — Чэрвень і, нарэшце, Убель.

Скульптура з'явіцца на плошчы Свабоды, насупраць гарадской ратушы.

Яшчэ адным кірункам падрыхтоўкі да юбілею стане ***даследаванне невядомых старонак творчасці*** Станіслава Манюшкі. Намеснік мастацкага кіраўніка «Беларускай Капэлы» Святлана НЕМАГАЙ збіраецца асаблівую ўвагу звярнуць на працы віленска-мінскага перыяду. Прагучалі ідэі ***выдаць альбомы*** з нотамі кампазітара і малюнкамі яго бацькі, зборнікі музычных твораў для навучэнцаў.

Манюшка быў каталіком і пакінуў пасля сябе вельмі багатую ***спадчыну духоўнай музыкі,*** якая сёння амаль не выкарыстоўваецца. Было б добра, каб у касцёле часам гучалі яго творы.

Істотным прабелам у нацыянальным культурным жыцці з'яўляецца тое, што ў оперным тэатры Беларусі цяпер ***няма ніводнай оперы*** гэтага кампазітара. З ініцыятывай вырашылі звярнуцца ў Вялікі тэатр оперы і балета і Музычны тэатр Беларусі.

Намеснік начальніка аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Чэрвеньскага райвыканкама Аксана КАЧАНОВІЧ завітала на сустрэчу, каб распавесці, што ў Чэрвені помнік Манюшку ўжо ўсталяваны. Адкрываць яго плануюць сёлета падчас конкурсу «Убельская ластаўка». Кожны год мясцовы калектыў «Ігуменскія крыніцы» ў дзень нараджэння Манюшкі выконвае музыку ў касцёле, праводзіцца імша.

Начальнік аддзела культуры Мінаблвыканкама Валянціна МАКАРАВА адзначыла, што ўсе агучаныя прапановы вельмі слушныя, але, каб яны сапраўды былі рэалізаваны ў жыцці, трэба акрэсліць канкрэтны план дзеянняў, прызначыць адказных (бо некаторыя ідэі трэба ўзгадняць на ўзроўні Савета Міністраў) і, калі магчыма, пазначыць, адкуль можа ісці фінансаванне. Прапановы накіроўваюцца ў Міністэрства культуры. Значна паспрыяла б справе і тое, каб агучаныя ідэі ўпісаць у новую пяцігадовую праграму «Культура Беларусі», якая распачнецца ў 2016 годзе. Тады можна будзе спадзявацца, што добрыя намеры стануць рэальнасцю да 200-гадовага юбілею кампазітара.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**